# Экскурсіі і паходы ў класах інтэграраванага навучання

**І. М. Бобла,**
кандыдат педагагічных навук, г. Мінск
**І. І. Захарэвіч,**
настаўнік-дэфектолаг Трабскай СШ Іўеўскага раёна

У нашай краіне заўсёды надавалася і надаецца значная ўвага выхаванню і навучанню моладзі. Вядома, што ў сілу пэўных прычын усе маладыя людзі не могуць займацца у школе па аднолькавай вучэбнай праграме. Таму і ствараюцца ўмовы навучання і выхавання ў адной школе дзяцей, якія займаюцца па розных вучэбных праграмах. Значная ўвага пры гэтым надаецца і выхаваўчай рабоце. Кожны настаўнік, у якой бы вобласці нашай краіны ні працаваў, мае магчымасць праводзіць з вучнямі, якія займаюцца ў адной школе, па дзвюх розных вучэбных праграмах пазакласную працу па вывучэнні роднага краю. Таму мы прапануем некаторыя парады па падрыхтоўцы і првядзенні паходаў і экскурсій з вучнямі, якія займаюцца ў класах інтэграванага навучання агульнаадукацыйных школ (праграма агульнаадукацыйнай школы і праграма для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні (цяжкімі парушэннямі маўлення)). Мы спадзяёмся, што рэкамендацыі дапамогуць настаўнікам у рабоце, але не выключаем і іншыя падыходы да вырашэння гэтай праблемы.

Экскурсіі і паходы – важная частка выхаваўчай работы ў класах інтэграраванага навучання агульнаадукацыйных школ. Яны прывіваюць вучням пачуццё калектывізму, спрыяюць развіццю ў дзяцей пазнавальнай дзейнасці. Значэнне паходу і экскурсіі яшчэ больш узрастае, калі яны спалучаюцца з грамадска-карыснай працай. Па свайму характару і мэта экскурсіі адрозніваецца ад мэты пахода.

*Экскурсія* – метад нагляднага азнаямлення школьнікаў з якім-небудзь аб’ектам. Яна праводзіцца па пэўнай тэме і распрацаванаму настаўнікам плану.

*Паход* – турысцка-краязнаўчае мерапрыемства, якое праводзіцца з мэтай усебаковага вывучэння роднага краю.

Такім чынам, калі экскурсія мае строга тэматычны характар, то паход мае комплексны характар. У час яго правядзення вучні знаёмяцца з прыродай родных мясцін, жыццём і бытам жыхароў, мясцовымі сельскагаспадпрчымі і прамысловымі прадпрыемствамі. Практыка паказала, што ў класах інтэграванага навучання агульнаадукацыйных школ мэтазгодна праводзіць блізкія экскурсіі і аднадзённыя паходы. У правядзенні экскурсіі ці паходу выдзяляюцца тры этапы:

1) падрыхтоўчая работа (педагога і вучняў);
2) непасрэднае правядзенне экскурсіі і паходу;
3) апрацоўка сабранага матэрыялу і падвядзенне вынікаў.

**Падрыхтоўчая работа**

Спачатку педагогам намячаецца тэма і вызначаецца мэта экскурсіі або паходу. Пасля пачынаецца падрыхтоўчая работа да іх правядзення.

Прывядзём прыкладны план падрыхтоўчай работы да правядзення экскурсіі ці паходу для вучняў, якія займаюцца ў класах інтэграванага навучання агульнаадукацыйных школ.

1. Распрацоўка даступнага для вучняў маршруту і плана правядзення паходу або экскурсіі.
2. Папярэдняе вывучэнне маршруту і аб’ектаў экскурсіі ці паходу кіраўніком (настаўнікам).

3. Азнаямленне з даступнай для вучняў літаратурай па тэме паходу або экскурсіі.
4. Размеркаванне паміж удзельнікамі паходу або экскурсіі абявязкаў.
5. Падрыхтоўка асабістай і групавой амуніцыі.
6. Правядзенне трэніровачных паходаў або экскурсій.
7. Знаёмства бацькоў вучняў з планам правядзення паходу або экскурсіі.

Рапрацоўку турысцкага маршруту праводзіць настаўнік. Вучні, якія займаюцца па агульнаадукацыйнай праграме, пад яго кіраўніцтвам складаюць маршрутную карту. Важна, каб пасільны удзел у гэтай рабоце прынялі і школьнікі, якія займаюцца па праграме для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні (цяжкімі парушэннямі маўлення). Настаўнік вылічвае агульную даўжыню ўсяго маршруту, яго асобных участкаў, вызначае аб’екты даследвання. У плане паходу ці экскурсіі ўказваюцца назва раёна паходу або аб’екту экскурсіі, тэма і мэта, даўжыня маршруту, працягласць экскурсіі ці паходу. Планам прадуглежваецца ўступная гутарка настаўніка аб мэтах і задачах паходу або экскурсіі і заключная гутарка аб выніках. Папярэдняе вывучэнне педагогам маршруту і яго аб’ектаў дае яму магчымасць уявіць сабе гэты маршрут, яго асаблівасці, падабраць цікавы матэрыял для гутарак з усімі вучнямі. У гэты час школьнікі вывучаюць прапанаваную настаўнікам літаратуру па тэме экскурсіі або паходу. Пры неабходнасці педагог аказвае сваім выхаванцам дапамогу. Асаблівую увагу ён звяртае на дзяцей, якія займаюцца па праграме для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні (цяжкімі парушэннямі маўлення). Зыходзячы з мэт і задач паходу або экскурсіі, паміж вучнямі размяркоўваюцца абавязкі і заданні. Настаўнік разам са сваімі выхаванцамі рыхтуе асабістую і групавую амуніцыю да будучага мерапрыемства. Своечасовая, старанна прадуманая падрыхтоўка асабістай і групавой амуніцыі да паходу або эксскурсіі садзейнічае паспяховаму правядзенню гэтага мерапрыемства. Выбар адзення і абутку залежыць ад пары года, а таксама мэт і працягласці экскурсіі або паходу. Выбар групавой амуніцыі для экскурсіі ці паходу таксама залежыць ад іх працягласці і пары года. Правядзенне трэніровачных паходаў або экскурсій дапамагае папярэдзіць тыя недахопы, якія могуць узнікнуць у будучым. Важнае месца ў падрыхтоўцы да правядзення экскурсіі або паходу мэтазгодна надаваць супрацоўніцтву з бацькамі вучняў.

**Правядзенне экскурсіі ці паходу**

Збор вучняў у вызначаны час звычайна адбываецца ў школе. Настаўнік па спісу правярае прысутных. Ён яшчэ раз напамінае сваім выхаванцам асноўныя правілы тэхнікі бяспекі ў час паходу ці экскурсіі. Пасля гэтага педагог і вучні адпраўляюцца ў дарогу. Важна, каб у дарозе дзеці вялі назіранні за прапанаванымі аб’ектамі. Таму карысна іх падзяліць на групы. Пры гэтым важна, каб у кожнай такой групе былі дзеці, якія займаюцца па праграме для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні (цяжкімі парушэннямі маўлення). Для вывучэння бяруцца аб’екты, якія найлепшым чынам адпавядаюць пастаўленым мэтам паходу або экскурсіі. З тым або іншым аб’ектам важна пазнаёміцца не толькі знешне. Настаўнік расказвае сваім выхаванцам пра гісторыю, характэрныя асаблівасці кожнага аб’екта, які сустракаецца ў дарозе. Для развіцця мыслення вучняў з цяжкасцямі ў навучанні (цяжкімі парушэннямі маўлення) мэтазгодана ставіць перад імі такія пытанні, якія пабуджаюць іх даваць адказы на аснове ўласных назіранняў, выкарыстоўваць дапамогу вучняў, што займаюцца па праграме агульнаадукацыйнай школы. Настаўніку варта планаваць маршрут так, каб на шляху яго выхаванцаў сустрэліся месцы пахавання чырвонаармейцаў ці партызан, якія

загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Важна не забыць і месцы пахавання тых людзей, якія здзейснілі свае подзвігі і ў мірны час. Да месцаў такіх пахаванняў мэтазгодна ўскласці кветкі, расказаць школьнікам гісторыю іх узнікнення. У дарозе вядзецца дзённік. Запісы ў ім ілюструюцца малюнкамі і фотаздымкамі. Збіраючы ў дарозе розныя экспанаты, вучні запісваюць ад каго, калі, дзе і што атрымана. Настаўнік дае кароткую гістарычную даведку аб падзеях, з якімі звязаны гэтыя экспанаты.

Якія абавязкі ўскладаюцца на педагога ў час правядзення паходу або экскурсіі? Назавём іх.

1. Забяспечваць выкананне плану паходу або экскурсіі, дысцыпліну яго ўдзельнікаў.
2. Сачыць за станам здароўя сваіх выхаванцаў.
3. Арганізаваць неабходную медыцынскую дапамогу захварэўшым.
4. Прыцягваць вучняў да грамадска-карыснай работы: выбару наглядных дапаможнікаў для школы, выканання іншых пасільных заданняў.
5. Праводзіць выхаваўчыю работу сярод сваіх выхаванцаў.
6. Даваць вучням зразумелыя тлумачэнні па тэме паходу або экскурсіі.
7. Падрыхтаваць з ліку школьнікаў, што займаюцца па агульнаадукацыйнай праграме, сваіх памочнікаў, якія будуць тлумачыць матэрыял сваім аднакласнікам, якія займаюцца па праграме для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні (цяжкімі парушэннямі маўлення).

**Падвядзенне вынікаў паходу ці экскурсіі**

Пасля таго як паход або экскурсія завершаны, настаўнік разам з вучнямі разглядае ўвесь сабраны матэрыял, праглядаюцца ўсе запісы ў дзённіку. Увесь справаздачны матэрыял ілюструецца малюнкамі, фотаздымкамі, планамі, зробленымі рукамі вучняў. Матэрыял, які сабралі дзеці, што займаюцца па праграме для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні (цяжкімі парушэннямі маўлення), варта паказаць іх бацькам.

Практыка паказала, што экскурсіі і паходы ў класах інтэграванага навучання агульнаадукацыйных школ павышаюць эмацыянальнасць успрымання вучнямі мастацкага вобразу, выпрацоўваюць ў дзяцей больш вострае адчуванне выяўленых магчымасцей слова, спрыяюць развіццю ў іх слыхавых успрыманняў, памяці, увагі, вобразнага мыслення.

Прапануем вашай увазе **пазакласнае мерапрыемства ў 5 класе інтэграванага навучання агульнаадукацыйнай школы (праграма агульнаадукацыйнай школы і праграма для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні (цяжкімі парушэннямі маўлення).**

***Тэма: «Сцяжынкі ў нашым горадзе»***

***Настаўнік***. Горад Іўе. Іўеўская зямля… Гэта – наша Радзіма, наша спадчына, якая аднойчы і назаўсёды даецца кожнаму чалавеку разам з жыццём.

***1-шы вучань.*** Іўе – адзін са старажытных населеных пунктаў нашай краіны. У пісьмовых крыніцах Іўе вядома з 1444 года. У 1742 годзе Іўе набыло статус мястэчка. Яно стала буйным гандлёвым цэнтрам. З 1795 года мястэчка ў складзе Расійскай імперыі.З 1920 года Іўе ўвайшло ў ў склад Польшчы. У 1939 годзе Іўе ўключана ў склад СССР. З 1940 года мястэчка стала цэнтрам Іўеўскага раёна, у 1960 годзе Юрацішкоўскі раён аб’яднаны з Іўеўскім і ўтвораны Іўеўскі раён з цэнтрам Іўе. Цяпер Іўе – цэнтр Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці. У 2000 годзе Іўе атрымала статус горада, а ў 2007 годзе зацверджаны сцяг і герб горада Іўя.

***2-гі вучань***. Пасмы сівыя
Мілая іва
Звесіла чынна
Гасцінным шатром.

***3-ці вучань***. Роднае Іўе,
Любае Іўе –
Маці Айчына,
Светлы наш дом.

***4-ты вучань***. Іўе – зямля дароў,
Іўе – зямля сяброў,
Славутае на вякі,
Славутыя землякі.

***5-ты вучань***. Цэрквы, мячэці,
Пікі касцёлаў
Верай і праўдай
Яднаюць хаўрус.

***6-ты вучань***. Праз ліхалецці
Слаўным суквеццем
Крочаць татарын,
Паляк, беларус.

***9-ты вучань***. На гербе нашага горада выражаны сімвал маці, міра, адукацыі. Фігура жанчыны, якая сядзіць ў княжаскім адзенні ўзору 16-17 ст.ст. – гэта абагулены вобраз прадстаўніц вядомых родаў Беларусі, якія ў свае часы былі ўладальнікамі горада. Раскрытая кніга ў яе руках служыць своеасаблівай данню жыхарам горада, які некалі быў адным з цэнтраў свецкага і духоўнага жыцця нашай краіны.

***7-мы вучань***. Давайце пройдземся па вуліцах горада. Вуліцы нашага гарадка бываюць вельмі прыгожымі ў розныя поры года.

***8-мы вучань***. *Вадзяны млын на р. Іўянка.* У канцы XIX пачатку XX ст. ў Іўі на рацэ Іўянка пачаў працаваць вадзяны млын Хаіма Нахімоўскага. Млын меў вялікае значэнне ў жыцці жыхароў не толькі мястэчка, але і навакольных вёсак З 1995 года ён ператвораны ў бар «Стары млын».

***3-ці вучань***. Спеў салаўіны ў наваколлі,
На хвалях кветкавы вяночак…
Хоць млын стары не круціць кола, -
Ён тайну нейкую прарочыць…

***5-ты вучань***. *Іўеўская крыніца*. Гэтае месца ведае кожны жыхар нашага гарадка. Крыніца належыць да рэдкага ва ўмовах Беларусі тыпу ўзыходзячых вытокаў, выхад вады з якіх ажыццяўляецца пад напорам. У час першай сусветнай вайны, у 1914 годзе, па ўказанни нямецкага афіцэра ў зямлю загналі жалезныя трубы на глыбіню больш за 40 метраў.

***6-ты вучань***. Іўе. Звонкая крынічка.
Птахаў райскіх спевы ў вішняку.
Нібы каралева, маладзічка
У вузенькім завулку-тупіку…

***2-гі вучань***. Спее, дзе татары, арабіна,
Возера пагушквае плыўца…

Іўе – горад руж і кут палынны,
Гучная метафара жыцця…

***1-шы вучань***. Іўе! Мчу к табе любой жарою,
У крылы шматабсяжныя твае,
І няхай нацятаю струною
Не смуткуе сэрца, а пяе.

***Настаўнік***. З даўніх часоў Іўе з'яўлялася шматнацыянальным мястэчкам.У ім на працягу многіх стагоддзяў мірна жылі і працавалі беларусы, палякі, татары, яўрэі. На тэрыторыі нашага гарадка акрамя ансабля кляштара бернардзінцаў знаходзяцца мячэць (1882 г.), царква Святога Гаўрыіла Беластоцкага (1995 г.), млын на рацэ Іўнянка (1926 г.), капліца на мясцовых могілках (1842 г.). Вялікую цікавасць выклікаюць пабудовы пачатку XX стагоддзя цэнтральнай часткі горада Іўя.

***7-мы вучань***. *Ансамбль кляштара бернандзінцаў у г. Іўі (1600-1631 гг.), касцёл Святых апосталаў Пятра і Паўла.* Першы касцёл у Іўі пабудаваны ў 1499 годзе пры каралю Яну Альбрэхту і Вялікім князю Літоўскім Аляксандру і названы ў гонар Святых Апосталаў Пятра і Паўла. У 1600 годзе па ініцыятыве Станіслава Кішкі на яго месцы быў узведзены касцёл з цэглы.

***Настаўнік***. Іўеўскі раён размешчаны на паўночна-заходняй частцы Гродзенскай вобласці. Ён мяжуе з Літвой, Ашмянскім, Лідскім, Навагрудскім і Воранаўскім раёнамі Гродзенскай вобласці. Дата стварэння – 15 студзеня 1940 года ў складзе Баранавіцкай, з 20 верасня 1944 года Маладзечанскай, а з 8 студзеня 1954 года Гродзенскай вобласці. Плошча раёна складае 1841 км$^2$. На пачатку 2015 года ў насельніцтва раёна складала каля 25 тыс. чалавек, а ў нашым горадзе пражывала крыху больш за 9 тыс. чалавек.

***8-мы вучань***. Цэтр нашага раёна – горад Іўе, размешчаны на рацэ Іўянка. Ён знаходзіцца ў 158 км ад г. Гродна, у 10 км ад чыгуначнай станцыі Гаўя на лініі Ліда – Маладзечна. Вузел аўтамабільных дарог – на Мінск, Ліду, Навагрудак, Вільнюс.

***9-ты вучань***. *Царква Святога Гаўрыіла Беластоцкага.* Царква размешчана ў будынку, які ў пачатку XX стагоддзя быў жылым домам, пасля Вялікай Айчыннай вайны – радзільным домам, а пасля 1970-х гадоў – дзіцячым садком-яслямі. У 1993 годзе мясцовыя ўлады перадалі яго праваслаўным вернікам. У 1995 годзе царкву наведаў Свяцейшы Патрыях Маскоўскі і ўсея Русі Алексій Другі.

***3-ці вучань. Мячэць.*** На працягу стагодзяў у гарадку мірна жывуць і працуюць татары. Яны ўносілі і ўносяць свой уклад у развіццё сваёй малой радзімы. Помнікі іх культуры ведаюць далёка за межамі нашага горада. Мячэць пабудавана ў 1882 годзе ў Мураўшчызне каля Іўя за сродкі Эльвіры Аўгусты Замойскай, уладальніцы мястэчка Іўя. На грошы эмігрыраваных ў Амерыку татар, якія прыслалі ў 1922 годзе 5000 долараў, дабудавалі мінарэт і галярэю.

***Настаўнік***. 22 чэрвеня 1941 года гітлераўская Германія напала на нашу краіну. Пачалася вайна. Насельніцтва нашага горада ў гады Вялікай Айчыннай вайны мужна змагалася з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Фашысты пасля захопу тэрыторыі Іўеўскага раёна пачалі ажыццяўляць палітыку тэрору ў адносінах да мірнага насельніцтва і партызан. Сведкамі гэтага засталіся брацкія магілы, мемарыяльныя комплексы на месцах баёў і злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У ваколіцах вёскі Стоневічы 12 мая 1942 года нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі вязнеў Іўеўскага гета. Загінула 2524 мужчын, жанчын, дзяцей яўрэйскага паходжання.

***6-ты вучань***. Тэрыторыя Іўеўскага рёна была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 7 ліпеня 1944 года. Наша малая радзіма мае сваю слаўную гісторыю, хоць тут і не было сусветна вядомых падзей. Іўеўская зямля зведала боль, галечу і знявагу ад розных прыгнятальнікаў і заваёўнікаў. Толькі пасля аб'яднання Беларусі ў 1939 г. пачаўся стваральны перыяд у жыцці нашага горада, але ён быў прыпынены Вялікай Айчыннай вайной. Мужнасць і гераізм праявілі жыхары раёна ў гады ваеннага ліхалецця, калі абаранялі сваю свабоду і гонар, актыўна ўдзельнічалі ў партызанскім руху.

***7-мы вучань.*** Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны мінула больш чым 70 гадоў. За гэты час адбудаваўся і папрыгажэў наш горад. Цяпер на Іўеўшчыне паспяхова развіваюцца селькагаспадарчая вытворчасць, прамысловасць, медыцына, адукацыя, культура.

***8-мы вучань***. Наш горад. На цэнтральнай яго плошчы ўстаноўлены памятны знак «Горад чатырох рэлігій». З кожным годам паляпшаецца дабрабыт яго жыхароў. Будуюцца і аднаўляюцца будынкі, добраўпарадкоўваюцца вуліцы. У дамы жыхароў нашага гарадка праведзены прыродны газ. Мясцовыя ўлады ўдзяляюць шмат увагі ветэранам вайны і састарэлым людзям. Не застаюцца без увагі і самыя маленькія жыхары нашага горада.

***9-ты вучань***. Іўеўшчына – цудоўны зялёна-блакітны куточак Беларусі. Ён прыцягвае ўвагу турыстаў, школьнікаў, краязнаўцаў, паляўнічых і рыбаловаў не толькі сваёй непаўторнай прыгажосцю, але і старажытнымі помнікамі прыроды, гісторыі і культуры.

***2-гі вучань***. Дарогі роўныя, як струны,
Навокал стройныя лясы…
А мы ў Іўе праз Лаздуны –
Да гэтай дзіўнае красы.

***3-ці вучань***. Нас вябяць вольныя прасторы
І закранае прыгажосць,
Дзе асалодай непаўторнай
Заўжды квітнее маладосць.

***1-шы вучань***. Сустрэнем позірк тут дзявочы
Над гладдзю іўеўскіх азёр.
Мы вельмі хочам, вельмі хочам
Паслухаць, як спявае хор.

***5-ты вучань***. Мы тут у Іўі сустракаем
Сваіх надзейнейшых сяброў.
Тут льецца песенка над краем,
І кружыць бусел зноў і зноў.

***6-ты вучань***. Па гулкіх вуліцах мы крочым,
Кідаем позИрк на дамы.
І быццам бы за намі сочаць
Сівыя вежы даўніны.

***4-ты вучань***. Крыніца памяццю бруіцца,
Пачуцці будзіць і настрой.
Нам горад Іўе будзе сніцца –
Ён ззяе вечнаю вясной.

***8-мы вучань*** Заве ў Іўе нас дарога…
Крыжы ўзняты тут да неба, –

Сюды ў касцёл заве да Бога
У малітве вечная патрэба.

***Настаўнік***. Вось і закончылася наша падарожжа. Што ў ім вам найбольш запомнілася (выказванні вучняў). Мы не змаглі пабываць ва ўсіх куточках нашага горада, але тое, што ўбачылі і пачулі, спадзяюся закранула вашы сэрцы, выклікала пачуццё гордасці за мінулае нашай малой радзімы. Якія пажаданні вы можацеа выказаць яе жыхарам? (выказванні вучняў).

**Літаратура**

1. **Каваль, У. І.** Чым адгукнуцца словы / У. І. Каваль. – Мінск: Народная асвета, 1994.– 48с.
2. **Лыч, Л. М.** Назвы зямлі беларускай / Л. М. Лыч. – Мінск: Універсітэцкае, 1994.– 128с.

**Дадатак да пазакласнага мерапрыемства ў 5 класе інтэграванага навучання агульнаадукацыйнай школы « Сцяжынкі ў нашым горадзе»**

**Бар «Стары млын» (вадзяны млын Хаіма Нахімоўскага)**



**Памятны знак ”Горад чатырох рэлігій”**



# Герб горада



# Каталіцкі касцёл імя
# святых апосталаў Пятра і Паўла



## Мячэць



## Праваслаўная царква святога Гаўрыіла Беластоцкага

